**23.** Дапоўніце народнае выслоўе.

*Не пытайся, які гаспадар, калі … .*

*1) спіна не баліць; 2) вароты падаюць, а колы рыпяць;*

*3) пад'ясі ў ахвоту; 4) гаспадыня за пірог; 5) сытым не будзеш.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**24.** Заснавальнікам беларускага кнігадрукавання з'яўляецца … .

**А)** Сымон Будны. **Б)** Францыск Скарына. **В)** Сімяон Полацкі.
**Г)** Мялецій Сматрыцкі. **Д)** Васіль Цяпінскі.

**25.** Выберыце з дадзеных словы, якія маюць нулявы канчатак.

*1) калекцыя; 2) мора; 3) клас; 4) палоззе; 5) масаж.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**26.** Многія народныя казкі пачынаюцца словамі "*ў трыдзявятым царстве, у трыдзясятым гасударстве*". Які лік у старажытныя часы абазначаў парадкавы лічэбнік *трыдзявяты*?

**А)** 9. **Б)** 19. **В)** 27. **Г)** 35. **Д)** 39.

**27.** Выберыце з дадзеных толькі назвы ганчарных вырабаў.

*1) відэлец; 2) гарлач; 3) збан; 4) спарыш; 5) слоік.*

**А)** усе назвы. **Б)** няма патрэбных назваў.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**28.** Ансамбль з двух выканаўцаў называецца *дуэт*. Як называецца ансамбль, у якім музыкантаў пяць?

**А)** сінтэз. **Б)** трыа. **В)** квартэт. **Г)** квінтэт. **Д)** сіндыкат.

**29.** Гэту кветку здаўна называлі кветкай вернасці, эмблемай "майскай каралевы". Шмат старажытна-грэчаскіх легенд было складзена пра яе. Навуковая назва кветкі абазначае ў перакладзе "мышынае вушка". Сок жа гэтай кветкі, як гавораць, мае арыгінальную ўласцівасць садзейнічаць зацвярдзенню сталі. Што гэта за кветка?

**А)** ружа. **Б)** незабудка. **В)** сон-трава. **Г)** фіялка. **Д)** дзьмухавец.

**30.** Колькасць літар алфавіта ў кожнай мове розная. Гэта залежыць ад фанетычных асаблівасцей мовы. У беларускім алфавіце 32 літары. А колькі літар у лацінскім алфавіце?

**А)** 18. **Б)** 23. **В)** 25. **Г)** 30. **Д)** 33.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 17. Тыраж 34700 экз. г. Мінск. 2018 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2018»

*Чацвер, 15 лютага 2018 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі прыметнікаў ужыта ў сказе?

*У небе месяц устаў зялёны і хутка стане снегавым (М. Багдановіч).*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**2.** Пра якое дрэва ў народзе гавораць: "*Ніхто яе не палохае, а яна дрыжыць*"?

**А)** пра бярозу. **Б)** пра вярбу. **В)** пра асіну.
**Г)** пра таполю. **Д)** пра сасну.

**3.** Янка хацеў напісаць у сачыненні пра беларускія стравы, пра тое, што ён любіць есці прыгатаваныя аладкі з дранай бульбы, але забыўся, як яны называюцца. Дапамажыце хлопчыку ўспомніць.

**А)** верашчака. **Б)** дранікі. **В)** праснакі. **Г)** кісель. **Д)** бліны.

**4.** Падлічыце, колькі слоў у вершаваных радках У. Караткевіча маюць **[э]**.

*Блякла-сіняе неба і чырвань галін.*
*Уздыхае ветрык. Спадае ліст.*
*Асцярожна сонца з голых асін*
*Выпаўзае на ціхі сінічны свіст.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 6. **Д)** 7.

**5.** Выберыце з дадзеных словы, якія маюць чатыры склады.

*1) мёдаварэнне; 2) беласнежны; 3) цецеруковы;*
*4) дзявяцера; 5) букініст.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**6.** Дадзены назвы беларускіх гарадоў:

*1) Мінск; 2) Барысаў; 3) Магілёў; 4) Орша; 5) Чачэрск; 6) Полацк.*

У якіх назвах ёсць **[*о*]**?

**А)** няма такіх назваў. **Б)** 1, 2, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 3, 4, 6. **Д)** 4, 6.

**7.** Колькі назоўнікаў можна ўтварыць, змяняючы толькі на месцы пропуску галосную (уласныя імёны не лічыць)?

*С..м.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**8.** Якое значэнне слова з дадзеных няправільнае?

*1) Сумёт – ‘ручны ткацкі станок’.*
*2) Крыніца – ‘натуральны выхад падземных вод на паверхню зямлі’.*
*3) Бухта – ‘невялікі марскі заліў, прыгодны для стаянкі суднаў’.*

**А)** усе значэнні слоў няправільныя. **Б)** усе значэнні слоў правільныя.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**9.** Хто па прафесіі выкарыстоўвае наступныя словы: *гледачы, прэм’ера, касцюм, грым*?

**А)** кравец. **Б)** шавец. **В)** сталяр. **Г)** артыст. **Д)** журналіст.

**10.** Які сінонім можна падабраць да слова *спакваля*?

**А)** рашуча. **Б)** паступова. **В)** мужна. **Г)** блізка. **Д)** хітра.

**11.** Адгадайце літаратурную загадку В. Жуковіча.

*Хто плыве па небе клінам*
*У асенняй цішыні?*
*І ўзгоркам, і далінам*
*Хто курлыча з вышыні?*

**А)** шпакі. **Б)** качкі. **В)** жураўлі. **Г)** чайкі. **Д)** вароны.

**12.** Як называецца той чалавек, які ўмее рабіць і рамантаваць печы?

**А)** цясляр. **Б)** маляр. **В)** пчаляр. **Г)** муляр. **Д)** будаўнік.

**13.** На якія пытанні адказвае даданы член сказа *азначэнне*?

**А)** хто? што? **Б)** што рабіць? што зрабіць?
**В)** каго? чаго? **Г)** які? чый? **Д)** калі? куды?

**14.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***я***?

*1) м..дуніца; 2) к..раміка; 3) л..мантаваць; 4) св..ткаваць.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Выберыце правільны адпаведнік рускага народнага выслоўя “*то и дело (беспрерывно, постоянно)*”.

**А)** як мага. **Б)** раз-пораз. **В)** стрымгалоў. **Г)** біць чалом. **Д)** сяк-так.

**16.** Якія словы з дадзеных напісаны правільна?

*1) атказаць; 2) аддаць; 3) бязхмарны; 4) расчысціў; 5) патпісаць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**17.** Якімі часцінамі мовы з’яўляюцца наступныя словы? Выберыце правільны варыянт.

*1) зверху; 2) цвіценне; 3) падтрымаць; 4) сваё; 5) неабсяжны.*
*а) назоўнік; б) прыметнік; в) дзеяслоў; г) займеннік; д) прыслоўе.*

**А)** 1-д, 2-а, 3-в, 4-г, 5-б. **Б)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-д, 5-а.
**В)** 1-а, 2-в, 3-д, 4-б, 5-г. **Г)** 1-а, 2-в, 3-д, 4-б, 5-г.
**Д)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в, 5-д.

**18.** У якім сказе няправільна вызначаны дзейнік?

*1) Дзеці сыплюць у кармушкі зярняткі.*
*2) Над кветкамі з самай раніцы ўюцца пчолы.*
*3) Яны хацелі зрабіць замалёўкі на прыродзе.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**19.** Якія назоўнікі з прапанаваных маюць форму толькі множнага ліку?

*1) апілкі; 2) металы; 3) дрожджы; 4) суніцы.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**20.** У народзе гавораць: *“Не святыя гаршкі ...”*. Якога слова не хапае?

**А)** абпальваюць. **Б)** лепяць. **В)** б’юць. **Г)** дораць. **Д)** носяць.

**21.** Вязынка – радзіма выдатнага беларускага паэта … .

**А)** Янкі Купалы. **Б)** Якуба Коласа. **В)** Петруся Броўкі.
**Г)** Максіма Багдановіча. **Д)** Уладзіміра Караткевіча.

**22.** Якія словы на месцы пропуску патрабуюць напісання мяккага знака (ь)?

*1) дзядз..ка; 2) ц..мяны; 3) кас..ба; 4) дз..муць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** толькі 3. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.